
ДУК «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма»
Камянецкая раённая дзіцячая бібліятэка
НЕАБСЯЖНЫ І ВЯЛІКІ СВЕТ
ЧАРОЎНЫХ ДЗІЦЯЧЫХ КНІГ
СЛАЙД-ПР'ЗЕНТАЦЫЯ
ПА БЕЛАРУСКІМ
КНІГАМ -ЮБІЛЯРАМ
Камянец,2019г.

У 2018 годзе шматлікія кнігі беларускіх пісьменнікаў святкуюць свае юбілейныя даты. Гэта кнігі для дзяцей і падлеткаў. Давайце пазнаёмімся з імі! І, магчыма, хто-небудзь захоча іх перачытаць. Ці прачытаць ўпершыню. Цікавага і ўдумлівага чытання, СЯБРЫ!

# Ляціць, гучыць Купалаў голас...



## Янка Купала 1882-1942

*Сапраўднае імя беларускага народнага паэта Янкі Купалы - Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Нарадзіўся ён у фальварку Вязынка (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). Вучыўся будучы класік беларускай літаратуры ў Беларускім народным вучылішчы (1898), на агульнаадукацыйных курсах у Пецярбургу (1909 - 1913), у народным універсітэце ў Маскве (1915). Працаваў хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага, малодшым прыказчыкам у памешчыка, практыкантам і памочнікам вінакура на бровары. Першы верш паэта - «Мужык» - быў апублікаваны ў 1905 годзе ў газеце «Наша ніва». Паэт стаў яе супрацоўнікам, а потым рэдактарам самай прагрэсіўнай газеты Беларусі таго часу. Літаратурную спадчыну паэта складаюць шматлікія зборнікі вершаў, ліра-эпічныя і драматычныя паэмы, п'есы, якія сталі класікай айчыннай літаратуры. Паэзія Купалы развівалася на аснове традыцый беларускага народа, увабрала лірызм і напеўнасць народнай песні. Уся творчасць Купалы-летапіс жыцця беларускага народу.*





Дом-музей. Мінск



Дом-музей. Вязынка







Дом-музей. Ляўкі



Парк імя Я.Купалы



Тэатр імя Я.Купалы

### Мая малітва

*Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,*
*Распетаю буду маліцца душой,*
*Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі*
*Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.*

*Я буду маліцца да яснага сонейка,*
*Няшчасных зімой саграваць сірацін,*
*Прыветна па збожных гуляючы гонейках,*
*Часцей заглядаці да цёмных хацін.*

*Я буду маліцца да хмараў з грымотамі,*
*Што дзіка над намі гуляюць не раз,*
*Каб жаль над гаротнымі мелі беднотамі,*
*Градоў, перуноў не ссылалі надчас.*

*Я буду маліцца да зорак і жаліцца,*
*Што гасяць сябе надта часта яны,*
*Бо чуў, як якая з неба з іх зваліцца,*
*З жыцця хтось сыходзе на вечныя сны.*

*Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю,*
*Каб лепшаю ўродай плаціла за труд,*
*Збагаціла сельскую хату пахілую,*
*Надзеі збытымі ўбачыў наш люд.*

*Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,*
*Распетаю буду маліцца душой,*
*Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі*
*Не вылі над роднай зямлёй, нада мной.*



Літаратурная спадчына



# Янка Купала «Шляхам жыцця» (1913)

Асноўным лірычным героям кнігі — становіцца рамантычны вобраз песняра-змагара, прарока светлай будучыні народу. Выдатнае мастацкае адкрыццё Купалы — гістарызм «Шляхам жыцця». З усведамлення славы і няславы, гераічнай велічы і трагедыйнасці гістарычнага мінулага лірычны герой зборніку вырастаў у фігуру незвычайнага маштабу, якая ўмяшчала ў сабе вялікую сілу аўтарскіх перажыванняў, выказаных па-мастацку раскавана, з бліскучай паэтычнай віртуознасцю.






# Янка Купала “Жалейка”(1908)

Першы зборнік твораў Янкі Купалы. Змест яго склалі лірычныя вершы і паэма «Адплата кахання», напісаныя ў 1905–1907 гг. Цэласная кніга лірыкі, найперш дум і перажыванняў, якія выказаны ад імя селяніна. Імкнучыся сцвердзіць сябе паэтам народных мас, выразнікам іх дум і пачуццяў, аўтар у шэрагу вершаў нібы даваў тлумачэнне, хто такі паэт Янка Купала, якія ў яго думы, перажыванні, песні, каму ён іх нясе, ахвяруе.



# Як песня народа – неўміручы наш Колас...

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе ня маю сілы!
Ня раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю...



**Якуб Колас**
**1882 - 1956**

*Кнігі Коласа нам*
*І калыскай, і школай былі,*
*І па новай зямлі*
*Нас у сённяшні дзень прывялі.*
*Песні Коласа нас*
*Навучылі Радзіму любіць,*
*Родны край бараніць,*
*Лютых ворагаў біць,*
*Ненавідзець мінуўшчыны здані,*
*Навучылі чытаць цёмных пушчаў паданні,*
*Разумець мову зор*
*І напевы азёр,*
*Хваляў нёманскіх звон,*
*Веліч сённяшніх дзён.*

*П. Панчанка "Сорак год"*






Тэатральная містэрыя




Вобраз вечнасці



# Якуб Колас «Новая зямля» (1923)

У паэме перад чытачом паўстае маніфэст магчымасьці годнага быцця, міру і дабрабыту, магчымасьці, якую дае зямля - месца і стымул жыццятворчасьці для кожнага сумленнага беларуса. З’явіўшыся ў тыя часы, калі фармаваўся філязофзкі падмурак нацыянальнае ідэі нашае дзяржавы і будучыня яе народу, за «Новай зямлёй» стала замацоўваецца эпітэт энцыклапэдыі жыцця беларускага сялянства канца XIX - пачатку XX стагоддзяў.



# Якуб Колас «Нёманаў дар» (1913)

Вясной у вёску прыехаў "стары скарбовы каморнік са сваімі інструментамі". Нёман, пракладваючы сабе новую дарогу, адрэзаў шырокую луку. Сяляне радаваліся, што будзе прыпынак для жывёлы. Аднак "нёманаў дар" забіралі ў вяскоўцаў. Сяляне абураны, бо гэты бераг ракі заўжды належыў ім, яны вырываюць пастаўленыя каморнікам межавыя слупы. Найбольшую актыўнасць праяўляе пры гэтым Андрэй Зазуляк.

Ганна, дачка Андрэя Зазуляка, падабаецца лясніку. Каб прывязаць да сябе дзяўчыну, ён пачаў шантажыраваць яе, што пасадзіць у астрог бацьку.

Ганна кахае Васіля Падбярознага. Даведаўшыся, чаму дзяўчына маркотная, Васіль абяцае прымусіць лесніка маўчаць.



# Янка Маўр
# 1883-1971гг















У краіне райскай птушкі
Жыццё ідзе без змен.
Наш Маўр – амаль што Пушкін,
Ці беларускі Твен.

Хоць не пісаў ён вершаў,
Ды чуўся цудны гук.
Для моладзі ён першы
Прапагандыст навук.

Пісьменнік і настаўнік,
Географ і фантаст –
У гісторыі бяспраўных
І перамогшых мас.

Народ – святое слова –
А шлях яго сыноў –
Шукаць свае асновы –
Ісці ізноў і зноў.

Ісці ў свой край апошні,
Туды, дзе цуд і звон,
Дзе жэмчуг можа кожны
Знайсці. Хай гэта сон…

…Скрозь змрок ляціць праменьчык,
А душы ўслед за ім.
А дзе гарыць агеньчык,
Туды і мы глядзім…




## Літаратурная спадчына

# Янка Маўр «Сын вады» (1928)

У аповесці «Сын вады» Маўр з глыбокай панікнёнасцю заглядае ў псіхалагічны свет маладога дзікуна Манга, паказвае, як у дзікуна з’яўляецца жаданне рассунуць навакольны свет, пазнаць яго. Безліч цяжкасцей на яго шляху. Але Манг усё перамагае, смела дабіваецца пастаўленай мэты. Што ж ён знаходзіць там? У адказе на гэта і заключаецца асноўны драматызм твора.






# Аркадзь Куляшоў
# 1914 – 1978гг.

*Шчасце ў тым, каб змагацца*
*за шчасце людзей…*





Смяяцца хочаш — смейся, як
дзіця.
Перад сабой і светам будзь
праўдзівы.
Прымай як дар жыццём пасланы
дзень,
І, можа, кніга гэта век імклівы
Дагоніць і абгоніць,
як прамень.

Вобраз вечнасці







*Літаратурная спадчына*

# Аркадзь Куляшоў «Сцяг брыгады» (1943)

Паэма «Сцяг брыгады», суровая і гераічная, мужная і стрыманая, раскрывае нам велізарны свет духоўнага жыцця беларускага народа ў гады вайны. Тут — усё, што прыйшло на Беларусь разам з вайною. Усё, чым жыў беларускі народ, яго працоўны матэрыяльны побыт і ўсе яго духоўныя багацці, звычаі, традыцыі, абрады — у непрымірымай варожасці з фашысцкім нашэсцем.








# Васіль Вітка
# 1911-1996гг.

Узяў мяне одум:
Хто я такі, адкуль родам?
І дазнацца ў мамы мусіў –
Беларус я, з Беларусі.







Літаратурная спадчына

# Васіль Вітка “Вавёрчына гора” (1948)

Казка «Вавёрчына гора» гэты твор з першых радкоў захапляе дзяцей, стымулюе іх увагу і эмоцыі, чытачы спачуваюць вавёрачцы, кранае іх тое, як усхвалявала яе гора ўсіх жыхароў, як ласкава, уважліва аднесліся да бяды вавёрачкі яе дзеці, унукі. Героі казкі сустракаюць на сваім шляху шмат нечаканых перашкод – тут нічога не даецца проста. У казцы «Вавёрчына гора» ачалавечаны не толькі звяры, птушкі, а нават маланка, гром, дождж.  Твор прасякнуты дабрынёй, спачуваннем.





# Алена Васілевіч

## 1922г.

«Ой мова матчына,
пявучая мая!
Густая нібы мёд,
іскрыстая, як сонца!..»















НА НЕЗАХМУРАНАЙ ВЯРШЫНІ




Літаратурная спадчына

# Алена Васілевіч “Калінавая рукавічка” (1963)

Галоўная тэма творчасці Алены Васілевіч — гэта праблемы сям'і, выхаванне дзяцей, маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Шмат Алена Васілевіч пісала для дзяцей. Яе казка «Калінавая рукавічка» ўвайшла ў беларускую дзіцячую класіку.



# Уладзімір Караткевіч

# 1930-1984гг.



У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы,
На ціхі стаў, на гаць.
Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха - быццам зніклі людзі ўсе.
Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму…
Ляцяць на ветры косы рыжай восені,
І кліча лісцяў жоўты сум зіму.















На вуснах стыне горкі смак рабіны,
Цалую іх, халодныя як лёд.
О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы,
Што ў векавечнай бацькаўшчыне клёны
Тысячагоддзі будуць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць,
Што нездарма яна з асінак рудых,
Калі ідзеш увосень па зямлі,
Раняе золата пад ногі людзям,
Каб мы яе любілі й берaглі.














**Літаратурная спадчына**

# Уладзімір Караткевіч “Каласы пад сярпом тваім” (1968)

Гэта твор пра драматычныя падзеі нашай гісторыі, перадумовы паўстання 1863–64 гг. Пісьменнік стварыў яркі вобраз эпохі, якая дала свету і нашай Айчыне сапраўдных герояў, мужных барацьбітаў за волю. Маштабнасць задумы твора бачна ўжо ў назве твора, што мае сімвалічна-алегарычны сэнс.



# МіколаГусоўскі

**1480-1533гг.**













Я ж разумею, што
тым, для каго
спяваю,
Праўда за ўсё
даражэй,
І пагэтаму стаўлю
Кропку над «і»:
невядомае мне
невядома.

*ВОБРАЗ ВЕЧНАСЦі*








# Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”(1523)

У творы падрабязна і дэталёва апісана паляванне на зубра. Грозны і страшны цяпер гэты лясны велікан. Пачынаецца поўнае драматызму адзінаборства людзей і магутнай жывёлы. Потым аўтар скіроўваецца да праблем чалавечага існавання. Ён са скрухай гаворыць, што слабее ад несупынных войнаў, людской нязгоды «Хрыстовая светлая вера». Асуджае моцных свету гэтага, якія не думаюць пра спакой і мір. Апошнія старонкі твора — малітва да Дзевы Марыі. М. Гусоўскі просіць Маці Божую, абаронцу слабых і скрыўджаных, каб ворагі «не цягнулі ў ярмо бездапаможны народ», каб князі, каралі зразумелі ўласнае здрадніцтва, каб мір запанаваў на зямлі.








# Максім Багдановіч

## 1891-1917гг







*«Ах, колькі ёсць*
*красы цудоўнай*
*поруч з намі,*
*калі глядзець вакол*
*дзіцячымі вачамі»*




**Літаратурная спадчына**

# Максім Багдановіча зборнік “Вянок” (1913)

У зборніку можна знайсці словы пра мары, спадзяванні паэта, яго інтымныя пачуцці прызнанні ў любові да роднай зямлі, пра адносіны да паэта і паэзіі. Яго цікавяць агульна - чалавечыя пытанні вечнага і часовага, праблемы жыцця і смерці, памяць.






**Складальнік: М.Л. Чоўжык**

**Раённая дзіцячая бібліятэка**

**вул. Леніна, 3 г. Каменец,**

**Брэсцкая вобласць**

**225051**

**Тэл. 8 (01631) 2-31-92**

**E-mail:** 22896@tut. by

**Сайт:** Kamlib.by

*Дзякую за увагу!*